(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 882.6.

**ДАНІЛЕНКА Сяргей Іванавіч**

# Беларуская літаратура XIX – XX стст.: вобразная спецыфіка сацыяльнай міфатворчасці

**10.01.01 – беларуская літаратура**

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
доктара філалагічных навук

Мінск – 2007

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Праца выканана ва Установе адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А.Куляшова"

| | |
|---|---|
| **Навуковы кансультант –** | доктар філалагічных навук, дацэнт Макарэвіч Аляксандр Мікалаевіч (УА "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А.Куляшова", кафедра беларускай літаратуры) |
| **Афіцыйныя апаненты:** | доктар філалагічных навук, прафесар Мальдзіс Адам Іосіфавіч (Міжнародная асацыяцыя беларусістаў) |
| | доктар філалагічных навук, прафесар Штэйнер Іван Фёдаравіч (УА "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны", кафедра беларускай літаратуры) |
| | доктар філалагічных навук, прафесар Кавалёў Сяргей Валер'евіч (Беларускі дзяржаўны універсітэт, кафедра гісторыі беларускай літаратуры) |
| **Апаніруючая арганізацыя –** | УА "Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С.Пушкіна" |

Абарона адбудзецца 23 сакавіка 2007 года ў $14^{30}$ гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62; тэл. вучонага сакратара: 227-61-40).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта (г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 4).

Аўтарэферат разасланы "22" лютага 2007 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый М.М. Хмяльніцкі

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

***Актуальнасць тэмы дысертацыі.*** Айчыннае літаратуразнаўства дагэтуль даволі асцярожна звяртаецца да асэнсавання міфалагічнага дыскурсу беларускай літаратуры. Міф вельмі часта лічыўся эўфемізмам чагосьці несапраўднага. Часам ён атаясамліваўся з цемрашальствам і забабоннасцю, якія толькі абцяжарваюць разуменне спецыфікі з'яў, што характаразуюць развіццё літаратурнага працэсу. Разам з тым, менавіта самыя архаічныя пласты чалавечага мыслення дазваляюць вылучыць і найбольш падсвядомыя, а таму найбольш трывалыя памкненні чалавечай душы ў зменлівым і часта варожым для чалавека свеце.

Глыбінная сутнасць надзвычай важных сацыяльна-культурных змен, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі на рубяжы XIX – XX стст., вельмі часта была незразумелай патрыярхальнаму беларускаму сялянству як арганічнаму прадукту феадальнага аграрнага соцыуму. Таму ў яго свядомасці новыя грамадскія працэсы няўхільнай капіталізацыі жыцця дэманізаваліся, што перадвызначалася асаблівасцямі архаічнай міфалагічнай свядомасці беларускага земляроба. Менавіта гэтую асаблівасць масавага народнага светапогляду і ўвасобілі ў сваіх творах прадстаўнікі інтэлектуальнай эліты тагачаснага беларускага грамадства, якія імкнуліся найбольш поўна і адэкватна адлюстраваць народныя памкненні да ідэальнага грамадства.

Узнікненне новага – савецкага – грамадства, якое мусіла пахаваць свет прыгнёту і ўціску, стаць увасабленнем адвечных народных мар пра справядлівасць, патрабавала літаратуры новага кшталту, якая ў іншых вобразах і іншых метафарах павінна была ўвасобіць веліч задум пабудовы новага свету дабрыні і справядлівасці, а таксама цяжкасці, праз якія мусіў прайсці савецкі народ дзеля здзяйснення гэтых задум. Савецкія пісьменнікі з энтузіязмам узяліся ў 20-я – 50-я гг. XX ст. за вырашэнне задачы, пастаўленай перад імі часам. Аднак пераважная большасць "новых" вобразаў, з якіх будаваўся сацыяльны міф савецкай дзяржавы (СССР – ідэальнае царства дабрыні і справядлівасці, вянец гістарычнага развіцця чалавецтва; савецкія кіраўнікі – сакральныя абраннікі, закліканыя здзейсніць адвечную гістарычную наканаванасць, і інш.), ужо мелі надзвычай сталую паводле паходжання і сэнсавага напаўнення традыцыю, з'яўляючыся па сутнасці сваёй вобразамі архетыпічнымі, што выводзілі свой радавод ад міфаў тварэння. Тым самым рэвалюцыйная ідэалогія, якая знайшла шырокае адлюстраванне ў савецкай беларускай паэзіі, з'яўляецца адным з найбольш удалых варыянтаў вечнага міфа абнаўлення. У гэтым кантэксце вызначэнне архетыпічных сэнсаўтваральных мадэлей беларускай літаратуры і іх гістарычных трансфармацый, скіраваных на мастацкае асэнсаванне сацыяльных фактараў грамадскага развіцця Беларусі XIX – XX стст. з'яўляецца надзвычай важным і актуальным.

***Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.*** Работа выканана ў адпаведнасці з планавай навуковай тэмай кафедры беларускай літаратуры УА "МДУ імя А.А.Куляшова" "Літаратурны працэс у сучасным асвятленні" (1996 – 2007 гг. выканання).

***Мэта дысертацыйнага даследавання*** – праз комплекснае і шматузроўневае даследаванне мастацкага засваення сацыяльнага міфа беларускай літаратурай XIX – XX стст. выявіць спецыфіку мастацкай маніфестацыі сацыяльнай міфатворчасці. У адпаведнасці з акрэсленай мэтай ставіліся наступныя **задачы**:

– вызначыць асноўныя заканамернасці міфалагізацыі літаратурна-мастацкага асэнсавання грамадска-палітычных змяненняў, якія адбыліся сярод беларускага соцыума XIX – XX стст.;

– раскрыць асаблівасці аксіялагічнай семантыкі сацыяльнага міфа, увасобленага ў беларускіх літаратурных тэкстах XIX – пачатку XX стст., а таксама залежнасць сэнсавага напаўнення беларускай літаратуры новага сацыяльнага міфа ад сацыяльнага падзелу тагачаснага грамадства;

– вызначыць і ахарактарызаваць ролю зааморфных вобразаў у працэсе складвання і развіцця літаратурнага сацыяльнага міфа Беларусі XIX – XX стст.;

– класіфікаваць сэнсаўтваральныя асаблівасці мастацкай сакралізацыі ў беларускай літаратуры савецкай дзяржавы і яе правадыроў, а таксама мастацкай дэманізацыі іх ворагаў паводле хрысціянскага архетыпу;

– выявіць і сістэматызаваць асноўныя заканамернасці міфалагізацыі беларускай літаратурай другой паловы XX ст. праяў крызісу камуністычнай ідэалогіі на сэнсаўтваральным і стылёвым узроўнях.

***Аб'ект і прадмет даследавання***. Аб'ектам даследавання з'яўляецца беларуская літаратура XIX – XX стст. Прадмет даследавання – хрысціянскі дыскурс сацыяльнай міфатворчасці ў беларускай літаратуры.

Эмпірычным матэрыялам для даследавання паслужылі творы А. Міцкевіча, Я. Чачота, Т. Зана, Я. Баршчэўскага, І. Ходзькі, Г. Ржавускага, Ю. Крашэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, К. Сваяка, Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, А. Гаруна, М. Чарота, Я. Журбы, П. Броўкі, М. Лужаніна, А. Куляшова, П. Глебкі, М. Танка, П. Панчанкі, У. Караткевіча, Н. Гілевіча, В. Зуёнка, Я. Янішчыц, М. Башлакова, У. Марука, А. Канапелькі, С. Законнікава, П. Шруба, М. Мятліцкага, А. Грачанікава, А. Пісьмянкова, У. Паўлава, А. Зэкава, Я. Сіпакова, Г. Марчука, С. Кавалёва, Ю. Станкевіча, Г. Багданавай і інш.

***Гіпотэза***. Спецыфіка працэсу сацыяльнай міфатворчасці ў беларускай літаратуры XIX – XX стст. заключаецца ў тым, што мастацкае пастуліраванне яе асноўных архетыпаў і міфалагем з'яўляецца вынікам крызісу патрыярхальнага аграрнага соцыума, заснаванага на каштоўнасцях іудзеа-хрысціянскай цывілізацыі, ва ўмовах мадэрнізацыі і капіталізацыі грамадскага жыцця.

***Метадалогія і метады праведзенага даследавання.*** Для вырашэння пастаўленых задач выкарыстоўваліся асноўныя прынцыпы рытуальна-міфалагічнай крытыкі, герменеўтыкі (гістарычная рэканструкцыя літаратурнага тэксту) і параўнальна-гістарычнага метаду.

Агульнатэарэтычнай асновай даследавання сталі працы па праблемах паэтыкі і эстэтыкі літаратурнай творчасці М. Аляксеева, А. Андрэева, П. Брунэля, М. Бахціна, А. Ваські, А. Дзімы, Д. Дзюрышына, В. Жырмунскага, Д. Зяленіна, Б. Кандакова, Л. Кішкіна, М. Лотмана, К. Пішуа, А.-М. Русо, І. Талстога, М. Храпчанкі, М. Эліядэ і іншых даследчыкаў.

Дысертант абапіраўся таксама на гісторыка-тэарэтычныя напрацоўкі прадстаўнікоў нацыянальнай філалагічнай школы, літаратуразнаўчыя даследаванні У.М. Казберука, В.А. Каваленкі, М.Р. Ларчанкі, А.А. Лойкі, А.М. Макарэвіча, А.І. Мальдзіса, У.І. Мархеля, А.М. Ненадаўца, Н.С. Перкіна, Г.П. Тврановіч, Я.К. Усікава, М.В. Хаўстовіча, Т.І. Шамякінай і іншых даследчыкаў.

***Навуковая навізна працы і значнасць атрыманых вынікаў*** заключаецца ў тым, што ўпершыню ў айчынным літаратуразнаўстве зроблены сістэмны і цэласны аналіз спецыфікі сацыяльнай міфатворчасці ў мастацкіх творах XIX – XX стст. у кантэксце інфернальнай вобразнасці. Вызначаюцца заканамернасці функцыянавання міфалагічных ментальных архетыпаў у мастацкіх тэкстах (творы А. Міцкевіча, Я. Чачота, Т. Зана, Я. Баршчэўскага, І. Ходзькі, Г. Ржавускага, Ю. Крашэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, К. Сваяка, Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, А. Гаруна, М. Чарота, Я. Журбы, П. Броўкі, М. Лужаніна, А. Куляшова, П. Глебкі, М. Танка, П. Панчанкі, У. Караткевіча, Н. Гілевіча, В. Зуёнка, Я. Янішчыц, М. Башлакова, У. Марука, А. Канапелькі, С. Законнікава, П. Шруба, М. Мятліцкага, А. Грачанікава, А. Пісьмянкова, У. Паўлава, А. Зэкава, Я. Сіпакова, Г. Марчука, С. Кавалёва, Ю. Станкевіча, Г. Багданавай і інш.), а таксама сацыяльныя працэсы, што перадвызначылі міфалагізацыю літаратурнай творчасці гэтых і іншых пісьменнікаў. На вобразным, сэнсаўтваральным і стылёвым узроўнях выяўляюцца і сістэматызуюцца асноўныя заканамернасці мастацкай сакралізацыі галоўных атрыбутаў савецкай дзяржаўнасці, дэманізацыі ворагаў савецкага ладу, міфалагізацыі крызісу камуністычных ідэй. Праведзеныя аналіз, вызначэнне, выяўленне і сістэматызацыя дазволілі выявіць характэрныя рысы творчай манеры пісьменнікаў, іх мастацкага метаду як паказальных асаблівасцей мастацкага адлюстравання неаднародных паводле грамадзянскай рэцэпцыі і ацэнак сацыяльных з'яў.

***Практычная значнасць атрыманых вынікаў.*** Праведзенае даследаванне істотна ўдакладняе і канкрэтызуе традыцыйную характарыстыку асноўных заканамернасцей развіцця беларускай літаратуры XIX – XX стст. Тэарэтычныя абагульненні і высновы могуць служыць навуковым падмуркам для далейшых даследаванняў як новай, так і старажытнай беларускай літаратуры, больш шырокага выяўлення і характарыстыкі заканамернасцей і шляхоў развіцця літаратурнага

працэсу Беларусі ў кантэксце цыклічна-хвалевага працэсу беларускай літаратурнай міфатворчасці. Фактычны матэрыял дысертацыі, яе асноўныя палажэнні і высновы могуць быць выкарыстаны пры стварэнні падручнікаў па гісторыі беларускай літаратуры і навуковых дапаможнікаў для студэнтаў ВНУ, пры падрыхтоўцы лекцый, спецкурсаў і спецсемінараў па беларускай літаратуры XIX і XX стст.

***Асабісты ўклад прэтэндэнта***. Дысертацыя ўяўляе сабой самастойнае даследаванне з арыгінальнымі палажэннямі і высновамі, выкананае асабіста аўтарам на падставе даследавання шырокага фактычнага літаратурнага і гістарычнага матэрыялу.

***Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.***

1. З'яўленне інфернальнай вобразнасці ў творах беларускай літаратуры XIX – пачатку XX стст. як аднаго са знакавых элементаў беларускага сацыяльнага міфа стала заканамернай мастацкай рэакцыяй інтэлектуальнай эліты тагачаснага беларускага соцыума на новыя сацыяльна-палітычныя працэсы, звязаныя з разбурэннем феадальнага ладу. У беларускай літаратуры XIX – пач. XX стст. інфернальная вобразнасць стала дзейсным сродкам дэманізацыі новых сацыяльных з'яў, звязаных з развіццём капіталістычных зносін, якія перадвызначалі разбурэнне асноўных сацыяльных, этнічных і гендэрных стэрэатыпаў, што складалі ідэалагічны падмурак жыцця патрыярхальнага беларускага сялянства.

2. Крызіс традыцыйнай "сармацкай" ідэалогіі патрыярхальнай польска-беларускай шляхты ўвасобіўся ў літаратуры XIX ст. у "неасармацкай" сістэме эстэтычна-каштоўнасных арыентацый ("прыгожае – непрыгожае", "высокае – нізкае", "добрае – злое"), у якой на першы план выходзіла адлюстраванне ірацыянальнай, часта нематываванай амаральнасці, якая ацэньвалася ідэолагамі шляхецкага "неасарматызму" як нестрыманы бунт супраць абмежаванага рацыяналізму пурытанскай капіталістычнай маралі.

3. Развіццё новай беларускай літаратуры пачатку XX ст. вызначылася зацятай і бескампраміснай палемікай "сялянскіх" беларускіх пісьменнікаў з ідэалогіяй "неасарматызму". Тым самым першыя ідэолагі беларускага нацыянальнага Адраджэння (Ф. Багушэвіч, К. Сваяк, Я. Купала, Я. Колас, З. Бядуля, А. Гарун) паслядоўна і прынцыпова адмаўлялі ролю былой саслоўнай эліты ў справе фарміравання нацыянальна-патрыятычнай самасвядомасці беларускага грамадства ў новых гістарычных умовах.

4. У беларускай літаратуры XIX – XX стст. адным з найбольш знакавых мастацкіх увасабленняў перыферыйнага становішча карэннага насельніцтва Беларусі ў капіталістычна-індустрыяльнай сістэме вытворчых зносін з'яўляецца вобраз ваўкаваўкалака як архетыпічнага сімвала адзіночкі-бунтара.

5. Беларуская савецкая паэзія 20 – 50-х гг. XX ст. стала творчай формай мастацкага ўвасаблення камуністычных ідэй як паказчыкаў новага грамадска-палітычнага вучэння эсхаталагічнай скіраванасці, якое абвяшчала пакутніцкую і

ўратавальную ролю прамысловага пралетарыяту ў стварэнні новага грамадства, пабудаванага па законах дабра і справядлівасці. Пры гэтым у творах беларускіх паэтаў гэтага перыяду маладая савецкая дзяржава набыла фармальныя рысы апакаліптычнага Царства Божага, а яе палітычнае кіраўніцтва – фармальныя архаічныя прыкметы вышэйшай сакральнай абранасці. У беларускай паэзіі 20 – 50-х гг. XX ст. ваенна-палітычнае змаганне савецкай дзяржавы са сваімі ўнутранымі і знешнімі ворагамі набывае акрэсленыя міфалагічныя рысы эсхаталагічнага змагання сіл Дабра і Зла.

6. У беларускай паэзіі 60 – 80-х гг. XX ст. адлюстраваны пачатак крызісу савецкай сістэмы, яе палітычных і маральна-каштоўнасных каардынат, які ўвасобіўся ў паступовай страце гэтай сістэмай свайго эсхаталагічнага напаўнення.

7. Канчатковы крызіс савецкай дзяржаўна-палітычнай сістэмы супаў па часе з буйнейшай тэхнагеннай катастрофай – Чарнобыльскай аварыяй, якая многімі беларускімі паэтамі ў 1986 – 1996 гг. пачала асэнсоўвацца як эсхаталагічная падзея, знак божага пакарання за ранейшае адмаўленне беларускім народам традыцыйных маральна-рэлігійных падмуркаў жыцця на карысць камуністычным ідэалам.

8. Паслядоўнае мастацкае развянчанне сацыяльнага міфа савецкага грамадства, які быў пабудаваны на падмурках камуністычнай дактрыны, адбываецца ў шэрагу твораў беларускай літаратуры 60 – 90-х гг. XX ст. ("Легенда аб бедным д'ябле і аб адвакатах Сатаны" У. Караткевіча, "Сказ пра Лысую гару" М. Аўрамчыка і Н. Гілевіча, "Здані і пачвары Беларусі" Францішка Хлуса і Марціна Юра і інш.) у адпаведнасці з канонамі карнавальнай эстэтыкі і народнай смехавой культуры.

***Апрабацыя вынікаў дысертацыі.*** Дысертацыйнае даследаванне абмяркоўвалася на пасяджэннях кафедры беларускай літаратуры факультэта славянскай філалогіі УА "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.Куляшова" (пратакол № 9 ад 5 мая 2006 г.; пратакол № 10 ад 21 чэрвеня 2006 г.). Прамежкавыя і канчатковыя вынікі даследавання вызначылі змест выступленняў на 10 навуковых канферэнцыях:

1. Міжнародная навуковая канферэнцыя "Literatury i języki słowian wschodnich. Stan obecny i tendencje rozwojowe" (Аполе, 24 – 26 верасня 1996 г.).

2. Рэспубліканская навуковая канферэнцыя "Актуальныя праблемы беларускага літаратуразнаўства", прысвечаная 85-годдзю з дня нараджэння А. Куляшова (Магілёў, 25 – 26 сакавіка 1999 г.).

3. IX Міжнародная навуковая канферэнцыя "Droga ku wzajemności" (Беласток, 20 – 22 ліпеня 2001 г.).

4. Міжнародная канферэнцыя "Dzedzictwo przeszłości związków językowych, literackich i kulturowych polsko-bałto-wschodniosłowiańskich. Z języka i kulturz pogranicza" (Беласток, 17 – 18 кастрычніка 2001 г.).

5. Міжнародная навуковая канферэнцыя "Творчасць А. Куляшова і адукацыйна-асветніцкія праблемы сучаснасці" (Магілёў, 6 – 7 лютага 2002 г.).

6. XI Міжнародная навуковая канферэнцыя “Droga ku wzajemności” (Беласток, 18 – 20 ліпеня 2003 г.).

7. Другая міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная памяці А.В. Азароўскага (Магілёў, 25 – 26 сакавіка 2005 г.).

8. XIII Міжнародная навуковая канферэнцыя “Droga ku wzajemności” (Беласток, 15 – 16 ліпеня 2005 г.).

9. Международная научная конференция «Русская и белорусская литературы рубежа XX – XXI веков» (Минск, 25 – 27 апреля 2006 г.).

10. Міжнародная навуковая канферэнцыя “Куляшоўскія чытанні” (Магілёў, 26 – 27 красавіка 2006 г.).

***Апублікаванасць вынікаў.*** Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання знайшлі адлюстраванне ў 32 публікацыях, сярод якіх 2 манаграфіі, 22 навуковыя артыкулы ў навуковых часопісах і зборніках, 8 матэрыялаў навуковых канферэнцый. Агульная колькасць старонак апублікаваных матэрыялаў – 586.

***Структура і аб’ём дысертацыі.*** Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, дзвюх глаў і заключэння. Агульны аб’ём дысертацыі – 212 старонак, у тым ліку – 197 старонак асноўнага тэксту. Спіс выкарыстанай літаратуры ўключае 235 пазіцыі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

*У першай главе* **“Спецыфіка сацыяльнай міфатворчасці ў беларускай літаратуры XIX – пач. XX стст. у кантэксце яе інфернальнай вобразнасці”** вызначаюцца асноўныя заканамернасці зараджэння і паступовага фарміравання канцэптуальных асноў сацыяльнай міфатворчасці беларускага грамадства новага часу ў кантэксце хрысціянскай мадэлі свету.

Першая Рэч Паспалітая, што згінула ў XVIII ст., засталася ў памяці нашчадкаў узорам дзяржаўнага бязладдзя і неразважнасці. Рацыяналістычная Еўропа абсалютысцкіх манархій, эвалюцыя якой была скіравана ў бок пабудовы індустрыяльнага грамадства, не магла зразумець і прыняць культа неабмежаванай палітычнай свабоды старой феадальнай эліты Польшчы і Літвы. Такая свабода прывяла аб’яднаную дзяржаву да заняпаду. У гэтых варунках нават самі ідэолагі польскага вызваленчага руху не маглі даць рацыяналістычнага тлумачэння асноў новай польскай адраджэнскай ідэалогіі, таму яна мусіла ператварыцца ў падабенства містычнага “духабачання”. Зняверанасць у рэальных сродках вызвалення і аднаўлення страчанай дзяржаўнасці вылучала на першы план сацыяльнай міфатворчасці “рэчыпаспалітаўскага” адраджэння “сармацкую веру ў цуды”. Менавіта гэтая вера ў звышнатуральнае ўмяшанне вышэйшых сіл у рэальнае жыццё жывіла надзею грамадства былой Рэчы Паспалітай на вызваленне і давала сілы на змаганне. Найбольш яскравай і, бадай што, адзіна магчымай ва ўмовах расійскай

палітычнай цэнзуры формай маніфестацыі гэтай веры стала літаратура "крэсовага" рамантызму, заканамерным плёнам развіцця якой з'явілася новая беларуская літаратура. Палітычнае і ідэалагічнае змаганне XIX – XX стст. яна ўвасобіла ў метафарах адвечнага змагання сіл Дабра і Зла, убудавала рэаліі сучаснага ёй грамадска-палітычнага жыцця ў кантэкст сакральнай гісторыі. Натуральна ў гэтых варунках, што адным з цэнтральных персанажаў гэтай гісторыі з'яўляецца вобраз Д'ябла як традыцыйнага ўвасаблення сіл Цемры, варожых Богу і чалавеку.

*У раздзеле 1.1* **"Вобраз д'ябла як персаніфікацыя сацыяльных фобій патрыярхальнага беларускага селяніна ў беларускай літаратуры XIX – пач. XX стст."** разглядаюцца творы А.Міцкевіча, Я.Чачота, Я.Баршчэўскага, К.Вераніцына, Ф.Багушэвіча, Я.Купалы, В.Ластоўскага, дзе д'ябал як дэманічная істота паўстае ў чатырох сваіх асноўных абліччах: 1) антрапазааморфным; 2) зааморфным; 3) антрапаморфным; 4) нулеваморфным. Гэтыя аблічча адлюстроўваюць яго анталагічную адасобленасць і апрыёрную варожасць свету людзей і людской маралі. Дадзеная анталагічная адасобленасць, у сваю чаргу, грунтуецца на тых спакусах, якія прапаноўвае д'ябал чалавеку як ілюзію бязмежнай свабоды, умовай якой з'яўляецца вызваленне ад "страху Божага": прага нажывы, нерэгламентаваны секс, антысацыяльныя паводзіны, разрыў сваяцкіх сувязей.

З гэтага вынікае неабходнасць вызначэння ролі мастацкіх персаніфікацый абсалютнага зла ў сістэме 1) сацыяльных; 2) нацыянальных; 3) гендэрных стэрэатыпаў, што складаюць падмурак сацыяльнага міфа беларускага адраджэння XIX – пач. XX стст.

**1. Вобраз д'ябла ў сістэме сацыяльных зносін.** Мастацкай роллю гаранта матэрыяльнага дабрабыту перадвызначаецца надзвычай высокі сацыяльны статус д'ябла як персанажа мастацкай літаратуры. У творах беларускіх пісьменнікаў (Я.Чачот, Я.Баршчэўскі, К.Вераніцын, Ф.Багушэвіч; Я.Купала; У.Караткевіч) ён заўсёды персаніфікуецца як прадстаўнік сацыяльнай эліты. Найбольш яскравае ўвасабленне тое сацыяльнае зло, якое нясе селяніну д'ябал-пан у хаўрусе з панамі сапраўднымі, знаходзіць у творах Я.Баршчэўскага. На іх старонках паўстаюць малюнкі апошніх праяў ідылічнага Залатога веку Рэчы Паспалітай, дзе часам яшчэ пануе старасвецкая шляхецкая цнатлівасць і шчырая пабожнасць, якая не ўласцівая "новаму" панству эпохі расійскага прыгону, што прадало сваю душу д'яблу. Галоўнымі праявамі таго страчанага Залатога веку з'яўляюцца амаль райскі дабрабыт і амаль поўная адсутнасць паноў як сацыяльнага класу. Але з новымі часамі з'явіліся новыя хцівыя паны, якія прывялі за сабой дэманаў нажывы, бессаромных і беспакараных. Панаванне д'яблаў на Беларусі знаходзіць свае адметныя "вясковыя" метафары, якія ствараюць падабенства сялянскага Апакаліпсісу. Яны ўласцівыя светапогляду земляроба, які жыве з працы рук сваіх, у глыбокай і спакойнай суладнасці з прыродай. Але сама прырода паўстае вайной супраць селяніна, калі светам пачынаюць правіць грошы. Нястачамі і галечай абарочваецца для сялян

становіцца свядомая карнавалізацыя найбольш знакавых праяў савецкай і постсавецкай рэчаіснасці, што грунтаваліся на асноўных элементах камуністычнага сакрума. Пад карнавалізацыяй у дадзеным выпадку разумеецца пераклад абрадава-сімвалічнай мовы карнавальнага светаадчування на мову мастацкіх вобразаў, у прастору індывідуалізаванай фантазіі аўтара-творцы.

Узорамі іранічнай дэманізацыі і карнавалізацыі савецкай рэчаіснасці, што нарадзіла яшчэ беларуская савецкая літаратура, сталі аповесць У.Караткевіча “Легенда аб бедным д’ябле і аб адвакатах Сатаны” і паэма Ведзьмака Лысагорскага (М.Аўрамчык, Н.Гілевіч) “Сказ пра Лысую гару”. Гэтыя творы не былі ні “антысавецкімі”, ні “антыкамуністычнымі” паводле сваёй скіраванасці, хоць уяўлялі сабой узор дасціпнай сатыры на савецкі ідэалагічны апарат, неад’емнай часткай якога з’яўляліся беларускія савецкія пісьменнікі разам з іх Саюзам. Творы выкрываюць тыя заганы, з якімі ў свой час змагалася і партыя, але самі аўтары яшчэ не ўзнімаюцца да разумення таго, што з’яўленне гэтых заган – вынік дзейнасці дзяржаўна-палітычнай сістэмы, пабудаванай камуністычнай партыяй.

Афіцыйны пафас савецкай ідэалогіі страціў сваю дзейснасць, аднак савецкі ідэалагічны апарат выдатна разумеў небяспеку смеху для існавання савецкай палітычнай сістэмы, бо высмейванне яе крызісных праяў павінна было непазбежна прывесці да канчатковага асмяяння яе самой. І гэта было толькі справай часу. Ужо з сярэдзіны 80-х гг. XX ст. у спісах пачалі бытаваць творы, падпісаныя Ведзьмаком Лысагорскім-меншым: “Сказ пра Саўку Паўлава і групу хуткага адпору”, “Сказ пра Яфрэма Сакалова і тайную вячэру”. Саступаючы свайму папярэдніку і натхніцелю ў паэтычным майстэрстве, Вядзьмак Лысагорскі-меншы пайшоў значна далей за яго ў сатырычным выкрыцці нячшчырасці і няздатнасці да рэальнай справы савецкага ідэалагічнага апарату.

Ужо ў постсавецкі перыяд на Беларусі з’явіўся шэраг твораў, аўтары якіх (Г.Багданава, С.Кавалёў, Г.Марчук, Ю.Станкевіч і інш.) з розных ідэйных і эстэтычных пазіцый імкнуліся сродкамі інфернальнай вобразнасці пераасэнсаваць знакавыя з’явы савецкай рэчаіснасці і яе спадчыны. Так, Г.Марчук у п’есе “Блудны муж і Варвара” на падмурках карнавальнай эстэтыкі імкнецца рэабілітаваць маральныя і ідэйныя каштоўнасці сацыялістычнай эпохі, іранічна дэманізуючы “д’ябальскія” праявы новага жыцця. У сваю чаргу, у п’есах Г.Багданавай “Рамантычнае падарожжа на той свет”, С.Кавалёва “Стомлены д’ябал” і Ю.Станкевіча “Армагедон – 1895” падобнай дэманізацыі ў большай ці меншай ступені падлягае зусім недалёкая савецкая мінуўшчына, якая, на думку аўтараў, і спарадзіла негатыўныя праявы сучаснага ім жыцця. Разам з тым, найбольш паслядоўнай і мэтанакіраванай спробай мастацкай дэскрэдытацыі савецкай і камуністычнай ідэйнай спадчыны сродкамі смеху і інфернальнай вобразнасці ў традыцыях карнавальнай культуры стала кніга “Здані і пачвары Беларусі”(1995), падпісаная імёнамі Францішка Хлуса і Марціна Юра.

Такім чынам, пачынаючы з 20-х гг. XX ст. у асэнсаванні сацыяльных з'яў беларуская літаратура прайшла шлях ад сакралізацыі савецкага ладу, дэманізацыі знешніх і ўнутраных ворагаў савецкай краіны да адлюстравання паступовага заняпаду камуністычных ідэй. У шэрагу твораў беларускай літаратуры 70 – 90-х гг. XX ст. сацыяльны міф савецкага грамадства, пабудаванага на падмурках камуністычнай дактрыны, быў асмяяны і развянчаны паводле класічных канонаў карнавальнай эстэтыкі і народнай смехавой культуры. Разам з тым, іранічная дэманізацыя сацыяльных з'яў навакольнага жыцця з'явілася таксама дзейсным сродкам ідэйнай палемікі розных кірункаў грамадска-палітычнай думкі Беларусі апошніх дзесяцігоддзяў XX стагоддзя.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**1.** З'яўленне ў творах беларускай літаратуры XIX – пачатку XX стст. інфернальнай вобразнасці стала заканамерным вынікам тварэння ўласнага сацыяльнага міфа інтэлектуальнай элітай тагачаснага беларускага грамадства, які паўстаў у якасці мастацкай рэакцыі на паступовы заняпад і дэградацыю патрыярхальнага аграрна-клерыкальнага соцыума, што з'яўляўся асноўнай апорай дзяржаўнага ладу колішняй Рэчы Паспалітай. Такая асаблівасць мастацкага адлюстравання няўхільнай капіталізацыі жыцця ўласціва як прадстаўнікам шляхецкай ідэалогіі неасарматызму (А.Міцкевіч, Г.Ржавускі, І.Ходзька, І.Крашэўскі), так і ідэолагам сялянскага руху (Ф.Багушэвіч, Я.Купала, М.Гарэцкі, А.Гарун) [1, 7, 31].

**2.** Адным з цэнтральных сярод інфернальных вобразаў з'ўляецца ў літаратуры XIX – пач. XX стст. вобраз д'ябла, які выступае ў чатырох іпастасях: антрапазааморфнай, зааморфнай, антрапаморфнай, нулеваморфнай. Гэтыя іпастасі падкрэсліваюць анталагічную адасобленасць д'ябла ад свету людзей, а таксама яго варожасць "адвечнай" чалавечай маралі, што выявілася ў наступным:

– праз вобраз д'ябла як сацыяльнага персанажа аўтары акрэсліваюць палярныя дамінанты (маральнае – амаральнае) у грамадскай атмасферы XIX – пач. XX стст. у кантэксце супрацьстаяння каштоўнасцей індустрыяльнага грамадства, варожых і непрымальных для старасвецкай патрыярхальнай маралі, носьбітамі якой была пераважная большасць беларускага сялянства (творы Я.Баршчэўскага, К.Вераніцына, Ф.Багушэвіча, А.Гаруна);

– у сістэме міжнацыянальных зносін, адлюстраваных у тагачасных творах беларускай літаратуры, вобраз д'ябла персаніфікуе перш за ўсё ксенафобію патрыярхальнага беларускага селяніна ў дачыненні да прадстаўнікоў этнасаў (немцы, яўрэі, рускія і інш.), што займалі больш прывілеяванае становішча ў новай сістэме вытворчых зносін, характэрнай для капіталістычнага ладу жыцця. Крызіс аграрнай сістэмы вытворчасці спрыяў мастацкай дэманізацыі чужынцаў у творах А.Міцкевіча, Я.Баршчэўскага, К.Вераніцына, Ф.Багушэвіча, А.Гаруна;

– крызіс і разбурэнне старой сістэмы вытворчасці непазбежна цягнуў за сабой крызіс патрыярхальнай сям'і і разбурэнне традыцыйнай гендэрнай стратыфікацыі патрыярхальнага грамадства – гэта знайшло сваё адлюстраванне са значнай ступенню іранічнай дэманізацыі ў творах А.Рыпінскага, Ф.Багушэвіча, К.Сваяка, А.Гаруна [1, 3, 5, 6, 8, 13, 16, 17].

**3.** Выразнікамі саслоўных інтарэсаў патрыярхальнай польска-беларускай шляхты сталі польскамоўныя пісьменнікі-рамантыкі – апалагеты ідэалогіі неасарматызму. Для ідэалогіі неасарматызму было характэрна наступнае: абсалютызацыя каштоўнасцей феадальнага клерыкальна-аграрнага грамадства, рэзкае непрыняцце палітычных і культурных змен, выкліканых развіццём капіталістычнага ладу вытворчасці.

Гэтыя асаблівасці грамадскай думкі паўплывалі на сістэму сэнсаўтварэння ў літаратуры польскамоўнага рамантызму Беларусі XIX ст. (А.Міцкевіч, І.Ходзька, Г.Ржавускі, І.Крашэўскі), для якой уласціва наступнае:

– галоўнымі героямі многіх твораў рамантыкаў-неасарматаў сталі постаці шляхецкіх авантурыстаў і злачынцаў (Яцак Сапліца, Міхал Валадковіч, Мікалай Патоцкі, Януш Радзівіл (Пане Каханку)), якія ў свой час служылі знакавымі персаніфікацыямі магнацкай злачыннай сваволі.

– эстэтыка ірацыянальнай, часта нематываванай амаральнасці прадстаўнікоў саслоўнай эліты Рэчы Паспалітай перыяду яе крызісу (XVIII ст.) станавілася для пісьменнікаў 30 – 40-х гг. XIX ст. крыніцай творчага натхнення;

– у знявечаных лёсах страчанага пакалення шляхецкай эліты саскіх часоў пісьменнікі неасармацкай плыні бачылі творчую метафізічную патэнцыю новага нестрыманага бунту супраць абмежаванага рацыяналізму пурытанскай капіталістычнай маралі, якую ўвасаблялі для іх прыхадні-акупанты;

– неасармацкая злачынная амаральнасць утварала ў мастацкай свядомасці польскамоўных рамантыкаў парадаксальны сімбіёз з падкрэсленым клерыкалізмам, персаніфікуючы месіянскую скіраванасць польскай шляхецкай ідэі – вечнай Залатой Вольнасці [1, 21, 22, 26, 28, 32].

**4.** Новая беларуская літаратура, якая стала заканамерным вынікам развіцця беларускай школы польскага рамантызму, выкарыстоўвала яе асноўныя ідэі і найбольш знакавыя вобразы: шляхціц-свавольнік, сармацкая "фантазія", ахвяра шляхецкага гвалту, пакаянне і пакаранне (А.Міцкевіч, І.Ходзька, Г.Ржавускі, І.Крашэўскі). Але гэтыя ідэі і вобразы атрымалі амаль адваротную мастацкую ацэнку і інтэрпрэтацыю, бо беларускія пісьменнікі служылі ў той жа час і выразнікамі інтарэсаў патрыярхальнага беларускага сялянства, якое мела досыць трывалы адмоўны вопыт сумеснага існавання ў межах адной краіны з адносна больш прывілеяваным шляхецкім саслоўем. Гэты вопыт быў пазначаны праявамі сацыяльнага гвалту і ўціску. Таму на старонках твораў Я.Купалы, М.Гарэцкага і, асабліва, У.Караткевіча многія героі іх літаратурных папярэднікаў свядома і

мэтанакіравана дэманізуюцца. Тым самым відныя ідэолагі беларускага нацыянальнага Адраджэння паслядоўна і прынцыпова адмаўлялі ў праве фарміравання самасвядомасці маладой еўрапейскай нацыі і такому яе складніку, як былая саслоўная эліта [1, 4, 15, 18, 21, 29, 32].

**5.** Адасобленае становішча карэннага насельніцтва Беларусі ў новай капіталістычна-індустрыяльнай сістэме вытворчых адносін знайшло сваё мастацкае ўвасабленне і ў вобразе ваўка-ваўкалака як архетыпічнага вобраза адвечнага выгнанца і бунтара. У літаратуры польскага-беларуска рамантызму з'яўляюцца два віды вобразаў ваўкалакаў. Першы ўвасабляе продкаў, заснавальнікаў дзяржаўнасці Вялікага княства Літоўскага (гэта князі-ваўкалакі, што абараняюць айчыну ад яе ворагаў – творы А.Міцкевіча, Я.Чачота), другі – пакутных выгнанцаў, што знаходзяцца ў канфлікце з соцыумам з-за недасканаласці яго законаў, далёкіх ад Закона Божага (яны не могуць знайсці ў сабе сілы для радыкальнага і дзейснага выступлення супраць варожага ім жыцця – творы П.Багрыма, Я.Баршчэўскага, А.Абуховіча, Я.Купалы).

У савецкай жа беларускай літаратуры (напрыклад творы Я.Коласа і У.Караткевіча) рысамі ваўкалакаў надзяляюцца паўстанцы, якія са зброяй у руках адстойваюць свой ідэал рэчаіснасці. Вобраз "савецкага" ваўкалака з'яўляецца па сутнасці вынікам сінтэзу дзвюх згаданых вышэй "класічных" іпастасей гэтага міфалагічнага вобраза. З аднаго боку, сваёй дзейснасцю ён прыпадабняецца да колішніх абаронцаў Айчыны, "князёў-ваўкалакаў", з іншага боку, падобна да ваўкалака-ахвяры, з'яўляецца выгнанцам, адасобленым ад соцыума [1, 27].

**6.** На змест, вобразнасць і асаблівасці мастацкага сэнсаўтварэння ў літаратуры 20 – 50-х гг. XX ст. паўплывала перамога на тэрыторыі былой Расійскай імперыі ідэй камунізму – грамадска-палітычнага вучэння эсхаталагічнай скіраванасці, што абвяшчала ахвярную (прафетычную) і ўратавальную (сатэрычную) ролю ў сусветнай гісторыі прамысловага пралетарыяту пад харызматычным правадырствам.

У творах беларускіх паэтаў гэтага перыяду (Я.Купала, Я.Колас, А.Куляшоў, П.Панчанка, П.Глебка, Ц.Крысько, Я.Журба) маладая савецкая дзяржава разам са сваёй сталіцай набыла акрэсленыя фармальныя рысы апакаліптычнага Царства Божага, увасобленага ў свой час на старонках Бібліі. Мастацкія вобразы ўладароў савецкага Зямнога Раю вызначаюцца фармальнымі архаічнымі прыкметамі вышэйшай сакральнай абранасці (уладар "царства справядлівасці" – салярны ўсепраніклівы дух плоднасці, гарант дабрабыту і бяспекі, ахвярны даравальнік несмяротнасці, грозны суддзя). У той жа час, унутраныя і знешнія ворагі СССР набываюць дэманічную афарбоўку: жывыя мерцвякі, персаніфікацыі хвароб, "нячыстыя" жывёлы (творы Я.Купалы, Я.Коласа, П.Панчанкі, П.Глебкі) [2, 9, 10, 11, 12, 14, 19, 24, 30, 31].

**7.** У 60-х – 80-х гг. XX ст. з усёй відавочнасцю вызначыўся пачатак сістэмнага крызісу савецкай ідэалогіі, якая, замест ранейшага ўслаўлення рэалій "новага" свету, пачынае прэтэндаваць на ролю абаронцы "старых" агульначалавечых каштоўсцей,

якімі “крывадушна” прыкрываюць сваю чалавеканенавісніцкую сутнасць заходнія капіталістычныя “фарысеі”. На змену старым ворагам – крыважэрным “злавесным мерцвякам”, прадстаўнікам аджылага свету (“генералам”, “панам-упырам”, “крывавым замежным бандзітам” і інш.), што беспаспяхова імкнуцца ўварвацца ў светлы “сад” Савецкай краіны, – у беларускую паэзію гэтага перыяду паступова прыходзяць новыя ворагі – “несапраўдныя” святары, якія толькі на словах служаць Богу дабрыні і справядлівасці, з’яўляючыся на самой справе служкамі Д’ябла і “залатога цяльца”, напоенага людскімі пакутамі і крывёй бязвінных ахвяр (творы М. Танка, П. Панчанкі, Я. Янішчыц, Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна, В. Зуёнка, С. Грахоўскага) [2, 23].

**8.** Канчатковы крызіс і заняпад савецкай дзяржаўна-палітычнай сістэмы супаў у часе з Чарнобыльскай аварыяй. Прынцыпова невымерны для чалавечага розуму маштаб гэтай тэхнагеннай катастрофы спарадзіў унікальны вопыт мастацкага асэнсавання беларускай літаратурай трагедыі свайго народа ў першае “чарнобыльскае” дзесяцігоддзе: гранічна шчыры і невымерна пранізлівы, бо ў дадзеных абставінах пазіцыя староннягa назіральніка была немагчымая па вызначэнні. Новая хваля апакаліптычных настрояў у беларускім грамадстве знайшла адлюстраванне ў паэтычных творах Э.Акуліна, М.Башлакова, А.Грачанікава, К.Жука, А.Зэкава, А.Канапелькі, У.Марука, М.Мятліцкага, С.Панізніка, У.Паўлава, А.Пісьмянкова, Я.Сіпакова, В.Стрыжака, П.Шруба, Я.Хвалея. Радыяцыйнае забруджанне тэрыторыі Беларусі, што нясло смяротную небяспеку яе насельніцтву, асэнсоўваецца ў канонах біблейскага архетыпу (“Апакаліпсіс”, “Плач Ераміі”, вавілонскі палон, Іудаў праклён і інш.) як непасрэднае Божае пакаранне за адступленне ад хрысціянскіх падмуркаў жыцця [2, 20, 25].

**9.** Канчатковае і паслядоўнае развянчанне сацыяльнага міфа савецкага грамадства, пабудаванага ў адпаведнасці з камуністычнай дактрынай, адбываецца ў шэрагу твораў беларускай літаратуры 70 – 90-х гг. XX ст. (творы У.Караткевіча, Н.Гілевіча, М.Аўрамчыка, С.Кавалёва, Г.Багданавай, Ю.Станкевіча). Савецкая ідэалагічная спадчына характарызуецца паводле класічных канонаў карнавальнай эстэтыкі і народнай смехавой культуры (гіпербалізацыя, травестацыя, віталізацыя) у ананімных творах “Сказ пра Лысую гару” Ведзьмака Лысагорскага і “Здані і пачвары Беларусі” Францішка Хлуса і Марціна Юра. Тут у першую чаргу асмяянню падверглася камічная неадпаведнасць высокіх ідэалаў, што абвяшчаліся савецкім кіраўніцтвам і яго прапагандысцкім апаратам, паўсядзённым рэаліям жыцця простага савецкага чалавека з яго надзённымі патрэбамі і памкненнямі [2].

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Манаграфіі**

1. Міф Адраджэння: харунжыя Бога. Спецыфіка сацыяльнай міфатворчасці ў беларускай літаратуры XIX – XX стст. у кантэксце яе інфернальнай вобразнасці: манаграфія. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2005. – 180 с.

2. Спецыфіка сацыяльнай міфатворчасці ў савецкай і постсавецкай літаратуры ў кантэксце яе інфернальнай вобразнасці: манаграфія / С.І.Даніленка. – 2-е выд. – Магілёў: Бел.-Рас. ун-т, 2005. – 229 с.

**Артыкулы ў навуковых часопісах**

3. Адзін з сялянскіх этнічных стэрэатыпаў беларускай літаратуры XIX – пачатку XX ст.: чужынец як чорт ці д'ябал // Веснік БДУ. Навукова-тэарэтычны часопіс Беларускага дзяржаўнага універсітэта. – Серыя 4. – № 3. – 2005. – С. 41 – 45.

4. Адлюстраванне ідэй польскага месіянізму ў аповесці Уладзіміра Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха" // Вестник МГЛУ. Серия 1. Филология. – № 4 (20). – 2005. – С. 191 – 195.

5. Антрапазааморфная, антрапаморфная іпастасі д'ябла ў беларускай літаратуры XIX ст. // Вестник Могилёвского государственного технического университета. – № 1. – 2005. – С. 60 – 65.

6. Асаблівасці асэнсавання гендэрных стэрэатыпаў у кантэксце інфернальнай вобразнасці беларускай літаратуры XIX – пач. XX стагоддзя // Вестник Полоцкого государственного университета. – № 7. – 2005. – С. 157 – 164.

7. Дэманізацыя вынікаў царскай палітыкі ў беларускай парэформеннай публіцыстыцы // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы. Серыя 1. Гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія, псіхалогія, правазнаўства, філалогія. – № 4 (35). – 2005. – С. 125 – 132.

8. Д'ябал як сацыяльны персанаж беларускай літаратуры XIX – пач. XX стст. // Вестник Полоцкого государственного университета. Гуманитарные науки. – 2005. – № 1. – С. 160 – 165.

9. Мастацка-публіцыстычная дэманізацыя ворагаў СССР у лірыцы Якуба Коласа канца 40-х – пач. 50-х гг. XX ст. // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М.Машэрава. – № 4 (38). – 2005. – С. 80 – 84.

10. Мастацкая дэманізацыя фашысцкіх захопнікаў у лірыцы беларускіх паэтаў часоў Вялікай Айчыннай вайны // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М.Машэрава. – № 4 (38). – 2005. – С. 85 – 89.

11. Міфалагізацыя змагання з ворагамі новага жыцця ў беларускай паэзіі 30 – 50-х гг. XX ст. // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова. – № 4. – 2005. – С. 79 – 81.

12. Міфалагічны матыў "ганебнага" пахавання ў лірыцы беларускіх паэтаў часоў Вялікай Айчыннай вайны // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова. – № 2 – 3. – 2005. – С. 95 – 97.

13. Особенности осмысления гендерных стереотипов в контексте инфернальной образности белорусской литературы XIX – XX вв. // Вестник Тульского государственного педагогического университета им. Л.Н. Толстого. Гуманитарные науки. – № 3. – 2005. – С. 223 – 231.

14. Хрысціянска-біблейскія алюзіі ў патрыятычнай лірыцы беларускіх савецкіх паэтаў часоў Вялікай Айчыннай вайны // Веснік Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. – № 2 (13). – 2005. – С. 72 – 75.

15. Асаблівасці нацыянальнай гісторыі ў прозе У.Караткевіча // Вестник МГЛУ. Серия 1. Филология. – № 2 (22). – 2006. – С. 219 – 224.

16. Вобраз д'ябла як персаніфікацыя ксенафобіі патрыярхальнага беларускага сялянства ў беларускай літаратуры XIX – пач. XX стагоддзя // Вестник Полоцкого государственного университета. – № 1. – 2006. – С. 105 – 108.

17. Зааморфная іпастась д'ябла ў беларускай літаратуры XIX – пач. XX ст. // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы. Серыя 1. Гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія, псіхалогія, правазнаўства, філалогія. – № 1 (36). – 2006. – С. 93 – 96.

18. Топас радавых партрэтаў у аповесці Уладзіміра Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха" // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова. – № 1 (23). – 2006. – С. 124 – 127.

19. Топіка "Скалы" ў патрыятычнай лірыцы беларускіх савецкіх паэтаў // Веснік Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. – № 1 (14). – 2006. – С. 69 – 73.

**Артыкулы ў навуковых альманахах і зборніках навуковых прац**

20. Архаічныя метафары ініцыяцыі ў паэзіі Уладзіміра Караткевіча // Terra Alba I. Праблемы беларускага літаратуразнаўства: (Да 85-годдзя з дня нараджэння А. Куляшова). – Мінск: "Маладзёжнае навуковае таварыства", 2000. – С. 147 – 153.

21. Новыя архіўныя звесткі аб продках Адама Міцкевіча // Terra Alba. Т. 2. Homo venerius: Сексуальная прастора беларускай культуры / Пад рэд. С.І. Даніленкі; Магілёўс. т-ва гуманіт. інтэлектуал. і культур. ініцыятыў "Брама". – Мінск: "Экаперспектыва", 2001. – С. 224 – 227.

22. Адлюстраванне ідэалогіі неасарматызму ў літаратуры польска-беларускага рамантызму // КРАЙ = KRAJ: (Polonica-Albaruthenica-Lithuanica): 1-2 (4-5) / Рэд. Я. Іваноў; ГА МТ "Брама". – Мінск: Энцыклапедыкс, 2002. – С. 72 – 80.

23. Дэманізацыя знешніх ворагаў СССР у беларускай паэзіі 60 – 80-х гг. XX ст. // У ракурсе сучаснага асэнсавання. Міжкафедральны зборнік навуковых прац, прысвечаны 90-годдзю МДУ імя А.А. Куляшова. Філалогія. Вып. 1. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2003. – С. 11 – 20.

24. Паэма Міхася Чарота "Ленін" у кантэксце сакралізацыі постаці правадыра сусветнага пралетарыяту // У ракурсе сучаснага асэнсавання. Міжкафедральны сборнік навуковых прац. Філалогія. Вып. 2. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2004. – С. 14 – 23.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

25. Аб Мёртвых Землях, сакральным мараходстве і чашы Святога Прычасця (Рытуальна-міфалагічныя вытокі творчасці У. Караткевіча) // Literatury i języki słowian wschodnich. Stan obecny i tendencje rozwojowe. Tom I. Materiały międzynarodowej konferencji naukowej. Opole, 24 – 26 września 1996. – Opole, 1997. – S. 102 – 105.

26. Адлюстраванне ідэалогіі неасарматызму ў літаратуры польска-беларускага рамантызму // "Dzedzictwo przeszłości związków językowych, literackich i kulturowych polsko-bałto-wschodniosłowiańskich. Z języka i kulturz pogranicza" Tom VIII. – Białystok, 2002. – S. 45 – 51.

27. Воўк і ваўкалак у літаратуры польска-беларускага рамантызму // Polsko-białoruskie związki językowe, literackie, historyczne i kulturowe. Materiały IX Międzynarodowej Konferencji Naukowej „Droga ku wzajemności". Białystok 20 – 22. VII. 2001. – Białystok, 2002. – С. 199 – 208.

28. Ідэалогія неасарматызму ў літаратуры Беларусі // Куляшоўскія чытанні. Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Творчасць А. Куляшова і адукацыйна-асветніцкія праблемы сучаснасці", 6 – 7 лютага 2002 г. – Магілёў: МДУ імя А. Куляшова, 2002. – С. 32 – 34.

29. "Антысармацкі" пафас аповесці Уладзіміра Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха" ў кантэксце літаратуры польска-беларускага рамантызму // Polsko-białoruskie związki językowe, literackie, historyczne i kulturowe. Materiały XI Międzynarodowej Konferencji Naukowej „Droga ku wzajemności". Białystok 18 – 20. VII. 2003. – Białystok, 2004. – С. 251 – 274.

30. Мастацкая дэманізацыя Ватыкана ў лірыцы Якуба Коласа канца 40-х – пачатку 50-х гг. XX стагоддзя // Материалы II Международной научной конференции, посвящённой памяти О.В. Озаровского (1935 – 1995), проводимой в рамках «Кулешовских чтений» (25 – 26 марта 2005 г.). – Могилёв: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – С. 83 – 85.

31. Мастацкая дэманізацыя капіталізму ў беларускай літаратуры XIX – пач. XX ст. // Куляшоўскія чытанні: матэрыялы Міжнароднай навук. канф., 26 – 27 красавіка 2006 г. – Магілёў: МДУ імя А.А.Куляшова, 2006. – С. 35 – 43.

32. Мастацкая палеміка ідэйных напрамкаў "сарматызму" і "антысарматызму" ў беларускай літаратуры XIX – XX стст. // Куляшоўскія чытанні: матэрыялы Міжнароднай навук. канф., 26 – 27 красавіка 2006 г. – Магілёў: МДУ імя А.А.Куляшова, 2006. – С. 240 – 243.

# РЭЗЮМЭ

**Даніленка Сяргей Іванавіч**

## Беларуская літаратура XIX – XX стст.: вобразная спецыфіка сацыяльнай міфатворчасці

**Ключавыя словы:** сацыяльны міф, сакралізацыя, інфернальная вобразнасць, дэманізацыя, ксенафобія, гендэрныя стэрэатыпы, архетып, вобраз ворага, вобраз д'ябла, неасарматызм, патрыярхальнае грамадства, традыцыйная культура, эсхаталагізм, біблейскі кантэкст.

**Даследуецца** сацыяльная міфатворчасць у беларускай літаратуры ў кантэксце яе інфернальнай вобразнасці.

**Мэта даследавання** – праз комплекснае і шматузроўневае даследаванне мастацкага засваення сацыяльнага міфа беларускай літаратурай XIX – XX стст. выявіць спецыфіку мастацкай маніфестацыі сацыяльнай міфатворчасці.

**Метадалагічная аснова работы.** Для вырашэння пастаўленых задач выкарыстоўваліся асноўныя прынцыпы рытуальна-міфалагічнай крытыкі, герменеўтыкі (гістарычная рэканструкцыя літаратурнага тэксту) і параўнальна-гістарычнага метаду.

**Асноўныя вынікі і навізна:** упершыню ў айчынным літаратуразнаўстве зроблены сістэмны і цэласны аналіз спецыфікі сацыяльнай міфатворчасці ў мастацкіх творах XIX – XX стст. у кантэксце інфернальнай вобразнасці. Вызначаюцца заканамернасці функцыянавання міфалагічных ментальных архетыпаў у мастацкіх тэкстах, а таксама сацыяльныя працэсы, што перадвызначылі міфалагізацыю літаратурнай творчасці пісьменнікаў дадзенага перыяду. На вобразным і сэнсаўтваральным узроўнях выяўляюцца і сістэматызуюцца асноўныя заканамернасці мастацкага асэнсавння крызісу аграрна-клерыкальнага ладу былой Рэчы Паспалітай ў рэчышчы еўрапейскай мадэрнізацыі XIX ст., мастацкай сакралізацыі галоўных атрыбутаў савецкай дзяржаўнасці, дэманізацыі ворагаў савецкага ладу, міфалагізацыі крызісу камуністычных ідэй. Праведзеныя аналіз, вызначэнне і сістэматызацыя дазволілі выявіць характэрныя рысы творчай манеры пісьменнікаў, іх мастацкага метаду як паказальных асаблівасцей мастацкага адлюстравання неаднародных паводле грамадзянскай рэцэпцыі і ацэнак сацыяльных з'яў.

Матэрыялы і навуковыя вынікі дысертацыі, што характарызуюцца канцэпцыйнай завершанасцю і цэласнасцю, могуць служыць метадалагічнай асновай для далейшага вывучэння праблем сацыяльнай міфатворчасці ў літаратуры, выкарыстоўвацца ў вучэбна-педагагічным працэсе.

# РЕЗЮМЕ

**Даниленко Сергей Иванович**

## Белорусская литаратура XIX – XX вв.: образная специфика социального мифотворчества

**Ключевые слова:** социальный миф, сакрализация, инфернальная образность, демонизация, ксенофобия, гендерные стереотипы, архетип, образ врага, образ дьявола, неосарматизм, патриархальное общество, традиционная культура, эсхатологизм, библейский контекст.

**Исследуется** социальное мифотворчество в белорусской литературе в контексте её инфернальной образности.

**Цель исследования** – через комплексное и многоуровневое исследование художественного освоения социального мифа белорусской литературой XIX – XX вв. выявить специфику художественной манифестации социального мифотворчества.

**Методологическая основа работы.** Для решения поставленных задач использовались основные принципы ритуально-мифологической критики, герменевтики (историческая реконструкция литературного текста) и сравнительно-исторического метода.

**Основные результаты и новизна:** впервые в отечественном литературоведении осуществлён системный и целостный анализ специфики социального мифотворчества в художественных произведениях XIX – XX вв. в контексте инфернальной образности. Определяются закономерности мифологических ментальных архетипов в художественных текстах, а также социальные процессы, которые предопределили мифологизацию литературного творчества писателей данного периода. На образном и смыслообразующем уровнях определяются и систематизируются основные закономерности художественного осмысления кризиса аграрно-клерикального строя бывшей Речи Посполитой, в русле европейской модернизации XIX в., художественной сакрализации главных атрибутов советской государственности, демонизации врагов советского строя, мифологизации кризиса коммунистических идей. Проведенные анализ, определение и систематизация позволили выявить характерные черты творческой манеры писателей, их художественного метода как показательных особенностей художественного отражения неоднородных по своей гражданской рецепции и оценках социальных явлений.

Материалы и научные результаты диссертации могут служить методологической основой для дальнейшего изучения проблем социального мифотворчества в литературе и использоваться в учебно-педагогическом процессе.

## SUMMARY

**Danilenka Siarhei Ivanavich**

### BELARUSIAN LITERATURE OF XIX–XX CENTURIES: IMAGE SPECIFICATION OF THE SOCIAL MYTH-WORKS

**Main words:** social myth, sacralisation, infernal images, demonization, xenophobia, hender stereotypes, archetype, enemy's image, image of devil, neosormatism, patriarchal society, traditional culture, eschatologism, bible context.

**Research of:** social myth-works in Belarusian literature in context of its infernal images.

**Research aim:** system research of the main laws in social myth-works process in Belarusian literature of XIX – XX centuries in context of its infernal images.

**Methodological base:** mythological critics, hermeneutics (historical literature text reconstruction) and comparativistics were used.

**The main results and novelty:** for the first time in the Belarusian history and criticism of literature the systematic and complete analysis of specification of the social myth-works in the XIX – XX centuries literature in context infernal images were made. The laws of myth mental archetypes function in texts, and social processes which form mythologisation of the writers' literature work at given time were definited. The main laws of art comprehension of the agrarian-clerical system crisis in former Rech Pospolitaya in channel of European modernization in XIX century, of art sacralisation of the Soviet state main attributes, Soviet system enemies deionization, communistic ideas crisis mythologisation were definited and systematized at image, sense and style levels. Conducted analysis, definition and systematization allowed to find out the characteristic traits of writers' art manner, their art method as the significant peculiarities of art reflection of the social phenomenon, which are not homogeneous in civil receptions and values.

The dissertation materials and science results have conceptional completion and can be used as a methodological base for further social myth-works in literature problems research, and be integrated in educational process.